**Гацко Ягор Уладзіміравіч,** *метадыст ДУА “Гродзенскі абласны цэнтр турызма і краязнаўства”*

# ГІСТОРЫКА-АРХЕАЛАГІЧНАЯ ЧАСТКА КРАЯЗНАЎЧАЙ ЭКСПАЗІЦЫІ ДУА “ГРОДЗЕНСКІ АБЛАСНЫ ЦЭНТР ТУРЫЗМА І КРАЯЗНАЎСТВА”

*У дадзеным артыкуле разглядаецца музейны пакой ДУА «Гродзенскі абласны цэнтр турызма і краязнаўства». Паведамляецца аб гісторыі яго стварэння. Паказваецца на якія часткі ён падзелены. Даецца апісанне экспанатаў і іх выкарыстанне пры правядзенні музейных заняткаў ці майстр-класаў. Апісваюцца новыя знаходкі і перспектывы пашырэння.*

Развіццё асобы, станаўленне поглядаў і жыццёвых арыентыраў пачынаецца з першых гадоў жыцця і скончваецца ў перыяд грамадскай сталасці чалавека. Першыя элементарныя звесткі чалавек атрымлівае ў сям’і. Потым эстафету пераймае школа. Станаўленне асобы не можа ажыццяўляцца самастойна, неабходна мэтанакіравана ўздзейнічаць на яе, ствараючы для гэтага ўмовы – праз змест школьнай праграмы, пазакласных заняткаў, напрыклад, музейных.

У 1910 г. у прадмове сваёй кнігі «Кароткая гісторыя Беларусі», славуты беларускі нацыянальны дзеяч і гісторык Вацлаў Ластоўскі напісаў: «Гісторыя – гэта фундамент, на якім будуецца жыццё народу. І нам, каб адбудаваць сваё жыццё, трэба пачаць з фундаменту, каб будынак быў моцны» [2, с. 5]. Таму нам трэба захоўваць тое, што засталося ад папярэдняга пакалення і перадаць як эстафету пакаленням будучым. У дадзенную постіндустрыйную, або інфармацыйную эпоху, калі хутка мяняюцца інтарэсы ў маладога пакалення, перад ДУА «ГАЦТіК» (далей – Цэнтр) вельмі важнай задачай становіцца вывучэнне гісторыі з дапамогай інфармацыйных тэхналогій і наглядных рэчаў мінуўшчыны, якія знаходзяцца ў музейным пакоі.

Важнае месца ў працы нашай ўстановы з 1989 г. займала навукова-даследчая дзейнасць юных геолагаў. У 1989 г. ў сярэдняй школе № 16 быў арганізаваны гурток юных геолагаў, якім кіраваўзагадчык масавага аддзела Цэнтра, прафесійны геолаг Жданюк Уладзімір Анатольевіч. У 2002 г. ім была перададзена частка калекцыі камянёў, якія былі знойдзены ў розных частках СССР. Гэта калекцыя стала пачаткам музейнага пакоя Цэнтра.

Геалагічная калекцыя складаецца з розных пародаў: амесціты, амазаніты, апаціты, біяціты, габро, жадзеты, кальцыты, малібдзеніты, селеніты, флюрыты, яшмы, і інш.

Так як наша ўстанова была створана ў 1950 г. як Абласная экскурсійна-турыстычная станцыя, то ў пакоі маецца невялікая экспазіцыя, прысвечана турыстычнай дзейнасці [1, арк. 1]. У экспазіцыі прадстаўлены фотаздымкі з паходаў, экспедыцыі, кубкі, медалі са спаборніцтваў.

Больш шырокай з’яўляецца краязнаўчая экспазіцыя, якая складаецца з трох частак. Адна частка прысвечаная Другой сусветнай вайне. У яе ўваходзяць наступныя артэфакты: нямецкія і савецкія каскі, 2 юбілейных медаля, гільзы, кулямётная лента ад МГ-42, жылезны падсумак ад нямецкага процігаза, міны, асколкі ад снарадаў.

Другая частка прысвечана гарадзенскім асобам-краязнаўцам: Я. Карскаму, Ю. Ядкоўскаму, Я. Каханоўскаму, А. Госцеву, В. Саяпіну. У ёй прадстаўлены фотаздымкі гэтых краязнаўцаў, іх кароткая біяграфія, кнігі.

Існуе таксама гісторыка-археалагічная частка краязнаўчай экспазіцыі. Яна пачала афармляцца ў 2020 г. Да гэтага года артэфактаў было мала. Яны прадстаўлялі з сябе купку матэрыяльных рэчаў: кавалкі крэменю, костка жывёлы, наканечнік капʼя, каваныя цвікі.

У 2020 г. аўтар пачаў ўдзельнічаюць на валанцёрскіх пачатках у археалагічных раскопках, каб знайсці, апрацоўваць і папаўняць гісторыка-археалагічную частку краязнаўчай экспазіцыі музейнага пакоя Цэнтра. Цягам года экспазіцыю папоўнілі шматлікія артэфакты.

На дадзены момант самым старажытным артэфактам з’яўляецца акамянеласць малюска, якому ад 145 да 66 млн. год.

З эпохі каменнага веку знаходзяцца кавалкі крэмня, апрацаваных чалавекам. Дадзеныя артэфакты былі знойдзеныя на помніках «Гродна-13» і «Гродна-16»  (Мелавыя горы).

З раскопак Старога замка ў фонд нашага музея былі перададзены кавалкі каменнай сцяны ад адтуліны. Дадзеныя адтуліны рабіліся пры дапамозе полага свердзела з алмазным наканечнікам, калі ў канцы XIV ст. вялікі князь Вітаўт перабудоўваў замак у цалкам мураваны.

Натуральна, што розныя помнікі архітыктуры ў нашым горадзе патрабавалі шмат будаўнічых матэрыялаў. Адзін з такіх была цэгла. Прадпрыемствы Гродна па вырабу дадзенага матэрыялу (цагельні) маглі знаходзіцца як у прыватных руках, так і пры касцёлах, кляштарах, цэрквах.

Сама цэгла заставалася даволі дарагім матэрыялам. Яе шырокае выкарыстанне ў горадзе адбылося пасля пажару 1885 г., калі палова будынкаў у горадзе была знішчана агнём. Тады і надыйшоў час для

запатрабаванасці цагельні Station Станіслава, якая належыла князям Друцкім-Любецкім [7, с. 10]. Магчыма цэгла, якая захоўваецца ў музейным пакоі і паходзіць з гэтага прадпрыемства. Цікавасць прадстаўляе жоўтая цэгла з кляймом «PFCK» і выявай якара.

Вышэйзгаданыя Друцкія-Любецкія займаліся не толькі вырабам цэглы. Пасля пажару 1885 г. яны пачалі расшыраць сваю справу ў сферы вырабаў будаўнічых матэрыялаў. У 1895 г. каля чыгуначнага вакзалу па вул. Пецярбургскай (сёння – Чырвонаармейская) яны адкрылі кафлярню. Дадзеная кафлярня карысталася попытам, як якасная прадукцыя.

У экпазіцыі знайшлося месца для гэтай кафлі. Экспанат прадстаўляе з сябе кавалкі кафлі жоўтага колеру на якой ёсць фірмовае кляймо «Stanisławów. P.Grodno». Напэўна выраблена ў міжваенны час.

XX ст. прадстаўлена наступнымі экспанатамі: гэта кніга «Жыццё і творчасць Эрнста Рэймана», 1905 г. выдавецтва; падручнік па правапісу і малітоўнік на польскай мове. Таксама, ёсць нямецкі жаўнерскі гузік часоў Першай сусветнай вайны. Прадстаўляе з сябе круглы металічны гузік з вывай кароны. І, нарэшце, невялікая (каля 10 см.) алавяная фігурка Божай маці.

Асобнае месца ў музейным пакоі займае нумізматычная калекцыя музейнага пакою. Манетаў – 22 шт. Яны прадстаўлены наведальніку на трох стэндах.

У першым стэндзе знаходзяцца наміналы: «грошы», «траякі», «чворакі», шастакі. На кожнай манеце – профіль каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх. А менавіта: «грош» з выявай Жыгімонта I Старога (1534 г.), «чворак» з выявай Жыгімонта II Аўгуста (1569 г.), «траяк» з выявай Стэфана Баторыя (1585 г.), «траяк» і «шастак» з выявамі Жыгімонта III Вазы (1622, 1624 гг. адпаведна), «шастакі» з выявамі Яна II Казіміра Вазы, Яна Сабескага, Аўгуста II Моцнага і Аўгуста III (1666, 1683, 1702, 1755 гг. чэканкі адпаведна).

На астатніх двух стэндах прадстаўлены манеты Рэчы Паспалітай 1766-1768 гг. чэканкі («соліды», «грошы», «паўгрошы», «траякі» і «шастакі»).

Нумізматычная калекцыя займае важную ролю пры выкананні розных музейных заняткаў з элементамі гульні або майстр-класаў.

ДУА «ГАЦТіК» знаходзіцца ў гістарычным цэнтры г. Гродна (зав. Тэлеграфны, 2) у будынку першай чвэрці XIX ст. Пры даследванні дадзенага будынка аказалася, што ў другой палове XIX па 1915 г. у ім быў прытулак Гродзенскага дабрачыннага таварыства. Гэты факт пацвярджае знойдзены план 1905 г. [5, арк. 27]. Сам прытулак насіў імя графа М.Н. Мураўева – душыцеля паўстання 1863-1864 гг. [4, арк. 8 зв.].

Членамі дадзенага таварыства ў той перыяд былі многія вядомыя асобы горада. Гэта маглі быць людзі з вядомых шляхецкіх фамілій, як напрыклад, князь Уладзіслаў Друцкі-Любецкі і князь Station Станіслаў Святаполк-Чацверцінскі. Сярод Членаў Праўлення былі і гродзенскія губернатары: Мікалай Мікалаевіч Цэймерн, Віктар Міхайлавіч Барзенка і Пётр Міхайлавіч Баярскі [3, арк. 144 зв.]; [5, арк. 15]; [6, арк. 4]. Губернскія правадыры дваранства: Іван Фадзеевіч Урсын-Нямцэвіч [3, арк. 144 зв.]. А таксама чыноўнік, які выконваў абавязкі старшыні гродзенскай гарадской управы Эдуард (Эдвард) Эдуардавіч Лістоўскі [4, арк. 20].

Пакуль не вызначана ці былі вядомая пісьменніца Эліза Ажэшка членам гэтага дабрачыннага таварыства. Паводле вышэйзгаданага плана, вядома, што ў пачатку ХХ ст. па суседству з домам сям'і Ажэшка стаяў будынак аптэкі таварыства, а за р. Гараднічанкай па тагачаснаму адрасу: завулак Тэлеграфны, 4 знаходзіліся будынкі прытулкаў для дзяцей і багадзельня для старых. Дакументальна гэта не пацверджана, але, з аднаго боку можна меркаваць, што Эліза Бенедыктаўна, вядомая як не толькі пісьменніца, але і як дабрадзей, наведвала гэтыя ўстановы і ахвяравала ім. Тым больш, што яе другі муж Станіслаў Нагорскі ёсць у спісе членаў Гродзенскага дабрачыннага таварыства за 1881 г. [3, арк. 144 зв.].

Усё гэта прыводзіць да думкі аб пашырэнні экспанатаў музейнага пакоя Цэнтра і стварэнні экспазіцыі прысвечаным гэтым людзям, а таксама арганізацыі, якая была нашым папярэднікам ў будынку.

Як паказвае практыка, Беларусь для навучэнцаў застаецца «terraincognita», то бок невядомай зямлёй. Невядомымі застаюцца шматлікія архітэктурныя аб'екты, гістарычныя асобы і родныя гарады. Час ідзе наперад, змяняюцца пакаленні, змяняюцца іх патрэбы і інтарэсы. Установы адукацыі ў такіх умовах вымушаны прапаноўваць новыя падыходы да моладзі. Нашай ўстанове дадатковай адукацыі ўдалося сабраць розныя цікавыя артэфакты, якія выконваюць важную ролю для выканання педагагічнага працэсу. З дапамогай экспанатаў можна стварыць музейныя заняткі з элементамі гульні, каб навучэнцам не было сумна. Напрыклад, нумізматычная калекцыя выкарыстоўваецца пры правядзенні майстр-класа «Вялікія князі. Ад Міндоўга да Панятоўскага". А з дапамогай плана 1905 дабрачыннага таварыства быў створаны музейны занятак з элементамі спартыўнага арыентавання «Тапаграфічная рэтраспектыва». Усе гэтыя заняткі прайшлі апрабацыю і мелі поспех у навучэнцаў.

Усе гэта стварае нагоду далей папаўняць новымі экспанатамі музейны пакой, каб іх выкарыстоўваць для новых адукацыйных ідэй.

**Бібліяграфія:**

1. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 730. – Воп. 1. – Сп. 316. Справаздача аб працы Гродзенскай экскурійна-турыстычнай станцыі за лета 1959 г. – Арк. 1.
2. Ластоўскі, В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі / В.Ю. Ластоўскі. – Мінск: «Універсітэцкае», 1993. – С. 5.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей - НГАБ). Ф. 1. – Воп. 16. – Спр. 1243. Статыстычныя звесткі да гадавой справаздачы аб стане Гродзенскай губерніі за 1881 г. – Арк. 144 зв.
4. НГАБ. Ф. 948. – Воп. 1. – Спр. 1. Спіс асобаў, атрымаўшых пасобія ад дабрачыннага таварыства; кандыдатаў у прытулак; пералік латарэйных выйграшаў за 1912, 1913, 1915 гг. – Арк. 8 зв., 20.
5. НГАБ. Ф. 948. – Воп. 1. – Спр. 6. Справа аб перадачы ў арэнднае ўтрыманне ўчастка зямлі дабрачыннага таварыства за 1913 – 1914 гг. – Арк. 15, 27.
6. НГАБ. Ф.948. – Воп. 1. – Спр. 18. Журнал паседжанняў Гродзенскага дабрачыннага таварыства за 1914 г. – Арк. 4.
7. Саяпін, В. На гродзенскім бруку / В. Саяпін, А. Вашкевіч. – Гродна: ЮрсаПрынт, 2016. – С. 10.